*Пралетарыі ўсіх краін, яднайцеся!*

# Беларускі універсітэт

Орган парткома, рэктарата, камітэта ЛКСМБ, прафкома і мясцкома
Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя В. І. Леніна

№ 2 (244) | Серада, 18 студзеня 1956 года | Цана 20 кап.

## ВАЖНЕЙШАЯ ЗАДАЧА ДНЯ

Наступіў адказнейшы перыяд у жыцці нашага універсітэцкага калектыву—зімовая экзаменацыйная сесія. У гэтым навучальным годзе яна супадае са знамянальнымі падзеямі ў жыцці нашай моладзі і усяго совецкага народа. Днямі закончыў сваю работу XIX з'езд ЛКСМБ. Хутка у сталіцы нашай Радзімы—Маскве адкрыецца XX з'езд Комуністычнай партыі Совецкага Саюза. Гэта абавязвае нашых студэнтаў і выкладчыкаў асабліва сумленна і з усёй стараннасцю аднесціся да экзаменаў, правесці сваю традыцыйную справаздачу перад Радзімай на высокім ідэйным і вучэбна-педагагічным узроўні.

На першым тыдні зімовай экзаменацыйнай сесіі выявіліся моцныя і слабыя бакі падрыхтоўкі студэнтаў па грамадскіх навуках і спецыяльных дысцыплінах, выявіліся таксама вынікі нашай вучэбнай і выхаваўчай работы. Гэтыя вынікі прымушаюць нас задумацца. Так, напрыклад, 11 студзеня на экзамене па псіхалогіі (дац. Е. П. Ерэсь) атрымалі нездавальняючыя ацэнкі студэнты Аўраменка, Пашына, Клімeнтава (гістфак). Аб нізкім узроўні выхаваўчай работы сведчаць факты абураючых паводзін студэнтаў у час заліку па асновах марксізма-ленінізма на II курсе геаграфічнага аддзялення, калі студэнты Татур, Новік прышлі на залік зусім непадрыхтаванымі. Больш таго, яны імкнуліся выкарыстаць шпаргалкі.

А комуніст I курса фізмата тав. Бадзяй, які на працягу усяго семестра абыякава адносіўся да заняткаў, не здаў неабходных работ і залікаў і зусім не з'явіўся на экзамены.

Ці можна мірыцца і з такімі фактамі, калі асобныя дэканаты не выконваюць вядомага законапалажэння аб экзаменах і заліках, дапускаючы да сесіі тых, хто мае акадэмічную запазычанасць. Так, 16 студэнтаў юрыдычнага факультэта, пяць з дзесяці студэнтаў, меўшых акадэмічную запазычанасць на філалагічным факультэце, былі уключаны у ведамасці і здавалі экзамены, хаця не мелі на гэта права. Былі такія і на гістарычным факультэце (Саковіч, Арлоў). Ці не відавочна, што ведамасці на гэтых факультэтах запаўняюцца механічна? Між тым, калі-б дэканы факультэтаў у апошнім тыдні снежня сабралі замацаваных за курсамі выкладчыкаў і заг. кафедр і абмеркавалі пытанне аб допуску студэнтаў да сесіі, такога становішча не стварылася-б. Дэканы і заг. кафедр павінны вывучаць склад студэнтаў і вырашаць індывідуальна пытанне аб тым, каму з маючых запазычанасць дазволіць яе ліквідаваць і ў якія тэрміны. Не цягнулася-б тады з курса на курс студэнтка II курса аддзялення рускай мовы і літаратуры С. Навіцкая, якая злоўжывала незаконнымі льготамі і не працавала над сабой. Экзамінатары Н. Хрыпко, Д. Фактаровіч толькі рукамі разводзілі, як яе дапусцілі да сесіі... Дэканы, абапіраючыся на загадчыкаў кафедр, павінны дабіцца выканання існуючага законапалажэння аб экзаменах і заліках. Толькі тады, калі мы закрыем усе шчыліны і пралазы для гультаёў, калі мы паставім іх твар у твар перад суровай неабходнасцю здаваць экзамены і залікі у тэрмін, толькі тады універсітэт вызваліцца ад баласту, які перашкаджае руху уперад нашай вышэйшай школы.

Асобнымі экзамінатарамі парушаецца законапалажэнне аб экзаменах і заліках. Так, білеты ў гт. Рудзіцкага і Пахута былі без подпісу заг. кафедры, экзамінатар тав. Янчанка некалькі дзён пасля экзамена затрымліваў ведамасць у сябе. Гэтыя парушэнні не мелі-б месца, калі-б увайшло у сістэму узаеманаведванне залікаў і экзаменаў, якое слаба укараняецца, нягледзячы на распараджэнне навучальнай часткі аб увядзенні асістэнтаў.

Так, 12 студзеня на экзаменах і заліках па асновах марксізма-ленінізма, псіхалогіі і палітэканоміі не прысутнічалі ні загадчыкі кафедр, ні асістэнты, ні прадстаўнікі дэканатаў. Калі-б кожны экзамен коратка абмяркоўваўся членамі кафедр, гэта-б узмацніла кантроль за устанаўленнем сур'ёзных патрабаванняў да студэнтаў. Іменна такую абстаноўку змаглі стварыць дэканат і партарганізацыя біёлага-глебавага факультэта, і таму экзамінатары дац. Шашкоў, дац. Рагожын, ст. выкл. Рабцэвіч былі задаволены адказамі студэнтаў.

Асноўнае у паспяховай здачы экзаменаў залежыць ад самога студэнта. Але многае патрабуецца і ад нашых грамадскіх арганізацый, ад вучэбнай часткі, ад дэканатаў, кафедр, адміністрацыйна-гаспадарчай часткі універсітэта. Іх задача—правільна арганізаваць кожны экзамен, стварыць для студэнтаў спакойную дзелавую абстаноўку, строга захоўваць расклад кансультацый і экзаменаў, не дапускаць выпадкаў зрыву і пераносу іх.

Асаблівую увагу трэба звярнуць на дзейнасць работнікаў адміністрацыйна-гаспадарчай часткі у падрыхтоўцы аудыторый да экзаменаў.

Актыўную дапамогу рэктарату, партыйнай арганізацыі павінны аказаць комсамольская і прафсаюзная арганізацыі універсітэта. Яны закліканы ажыццяўляць кантроль над падрыхтоўкай студэнтаў да экзаменаў, дапамагаць ім у наладжванні самастойнай работы, своечасова рэагаваць на усё тое, што перашкаджае нармальнаму ходу экзаменаў.

У перыяд сесіі не павінна паслабляцца палітыка-выхаваўчая работа сярод студэнтаў. Вопыт сцвярджае, што там, дзе палітыка-выхаваўчая работа у час экзаменаў не паслабляецца, а актывізуецца, яна станоўча адбіваецца на вучэбных паказчыках студэнтаў.

Экзаменацыйная сесія у разгары. Наперадзе многа напружанай і адказнай работы. Не паслабляць тэмпаў падрыхтоўкі і правядзення экзаменаў, няспынна нарошчваць іх, неадкладна ухіляць недахопы, якія выяўляюцца ў ходзе сесіі,—важнейшая задача дня.

### Станоўчы вынік

13 студзеня група студэнтаў IV курса гістарычнага факультэта здавала экзамен па спецкурсу «Рэвалюцыя 1905 года ў Беларусі».

З 22 здаваўшых экзамен, 20 студэнтаў атрымалі выдатныя адзнакі, 2 здалі экзамен на добра.



**На здымку:** група студэнтаў у мінералагічным музеі за падрыхтоўкай да чарговага экзамена.

## АДКАЗВАЮЦЬ ЖУРНАЛІСТЫ

Зноў на калідорах універсітэта многалюдна і шумна. Студэнты падчытваюць канспекты, высвятляюць незразумелыя пытанні агульнымі сіламі, віншуюць сваіх таварышаў, якія расчырванелыя выходзяць пасля здачы экзамена.

Каля аудыторыі № 66 сабраліся першакурснікі-журналісты. Яны здаюць сёння першы студэнцкі экзамен—вусную народную творчасць беларускага народа. Кожны хвалюецца. Усе з нецярплівасцю чакаюць: калі ужо нарэшце пакажацца таварыш, які здаў першы экзамен. Вось дзверы адчыняюцца, і паказваецца радасны твар студэнткі Ірыны Угольнік.

— Ну як, шмат пыталіся, колькі паставілі?—цэлы дзесятак пытанняў пасыпалася да Ірыны, і чыесьці рукі ужо выхапілі заліковую кніжку.

— Увага, таварышы! Іра атрымала першае «выдатна»,—хтосьці голасна абвясціў студэнтам.

Усе кінуліся віншаваць студэнтку з першай пяцёркай. Адзін за другім заходзяць першакурснікі. З экзамена усе вяртаюцца задаволеныя, радасныя. Радуецца і экзамінатар Дзіана Пятроўна Багрова. Ды чаму-б не радавацца. Усе студэнты добра падрыхтаваліся да экзаменаў і таму 15 з іх атрымалі «выдатна» і 13—«добра».

Побач з першакурсікамі хвалююцца і пяцікурснікі-журналісты. Яны ужо дзевяты раз здаюць экзамены. Яшчэ варта пахваляваць і больш за пяцікурснікаў—яны здаюць адзін з цяжкіх прадметаў—гісторыю літаратуры народаў СССР. Але і гэты сур'ёзны экзамен большасць студэнтаў вытрымала. 31 студэнт здаў экзамены на «добра», 11—на «выдатна» і толькі 4—на «пасрэдна». Студэнты-пяцікурснікі ведалі, што такія студэнты як А. Глебка, Г. Зотаў, Е. Зубараў, Г. Карлава падвядуць. І не памыліліся. Яны падвялі увесь курс. Яны дрэнна рыхтаваліся увесь семестр да заняткаў, і вось—вынік.

**Б. ПАЛЯШУК.**

## ГАВОРАЦЬ ЭКЗАМІНАТАРЫ

### ЭКЗАМЕН ПА ДЫЯЛЕКТЫЧНАМУ МАТЭРЫЯЛІЗМУ

Марксісцкая філасофія, як навуковы светапогляд, мае рашаючае значэнне у пазнанні законаў акружаючай рэчаіснасці.

Многія студэнты універсітэта сур'ёзна і глыбока вывучаюць філасофскія творы класікаў марксізма-ленінізма. Аб гэтым сведчаць экзамены па дыялектычнаму матэрыялізму.

Большасць будучых геолагаў на экзаменах паказала глыбокае веданне праблем марксісцкай філасофіі і твораў класікаў марксізма-ленінізма.

Так, у 48 студэнтаў, якія здавалі экзамен, адзнакі размеркаваліся наступным чынам: 18—«выдатна», 24—«добра», 4—«здавальняюча», 2—«нездавальняюча» (Шацёр і Чымбург).

Экзамены паказалі, што студэнты могуць авалодаць марксісцкай філасофіяй пры той умове, калі яны будуць сістэматычна наведваць лекцыі, семінарскія заняткі, канспектаваць творы, з'яўляцца на індывідуальныя і групавыя кансультацыі, актыўна удзельнічаць у абмяркоўваемых пытаннях на семінарскіх занятках.

Студэнты Себесевіч, Буко, Грыгаровіч, напрыклад, на пытанні экзаменацыйных білетаў давалі адказ больш або менш правільна, але калі былі пастаўлены пытанні па творах, то яны адказвалі слаба, няўпэўнена, наогул без ведання справы, хаця у іх і былі канспекты па некаторых раздзелах. Гэта адбылося таму, што яны неактыўна выступалі на семінарах, а Грыгаровіч 10 і 15 снежня зусім не была на занятках.

Студэнты Шацёр і Чымбург атрымалі «нездавальняюча» таму, што яны амаль не рыхтаваліся да семінарскіх заняткаў, зусім не слухалі лекцый і, як вынік, дрэнна адказвалі на экзаменах.

Так у час экзаменацыйнай сесіі выяўляецца работа кожнага студэнта на працягу семестра.

**А. І. ЛЕЎКО,**
**кандыдат навук.**

### Ганебны учынак

10 студзеня, прымаючы залік па асновах марксізма-ленінізма у студэнтаў II курса геаграфічнага аддзялення Новік, Маркевіч, Дзісько і Носік, я заўважыла чужыя канспекты, разарваныя на некалькі частак «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)». Пры адказе студэнты Новік і Татур паказалі поўнае няведанне матэрыялу. Вельмі слаба адказваў і староста гэтай групы Маркевіч, нягледзячы на вялікую колькасць «дапаможных» матэрыялаў. Што-ж датычыцца студэнта Новіка, то ён спрабаваў падмануць выкладчыка і такім шляхам атрымаць залік. Але гэта яму не удалося. За няведанне матэрыяла я паставіла яму незалік.

Падобныя учынкі падману выкладчыка, псавання падручнікаў і прадстаўлення выкладчыку не сваіх канспектаў з'яўляюцца недастойнымі і ганебнымі для совецкага студэнта. Але мяне больш за ўсё засмучае тое, што у групе гэтыя амаральныя учынкі не знаходзяць асуджэння, а усяляк пакрываюцца. На маё пытанне, хто парваў «Кароткі курс гісторыі ВКП(б)» і хто карыстаўся не сваімі канспектамі, ніхто з прысутных студэнтаў групы не адказаў. Гэты факт кругавой парукі і пакрывання гультаёў гаворыць аб нізкай свядомасці і забыцці комсамольцамі галоўнага свайго абавязку—змагацца з усякімі учынкамі, недастойнымі совецкага студэнта.

У гэтай-жа групе ёсць прыкладныя студэнты-комсамольцы—Жукава, Набунскі і іншыя. Яны паказалі глыбокія веды па марксісцка-ленінскай тэорыі. А вось пакрываючы абураючыя учынкі сваіх аднакурснікаў, гэтыя таварышы, памойму, паказалі сваё няправільнае разуменне дружбы і таварыства.

**Н. ШАВЕЛЬСКАЯ,**

### С. А. ПАХУТА: „Адказамі студэнтаў я задаволен"

Студэнты II курса аддзялення матэматыкі, магчыма, раней і не падазравалі аб існаванні у біялагічным корпусе нейкай там 54 аудыторыі. Сёння-ж, па волі лёсу, яе масіўныя дзверы набылі велізарную прыцягальную сілу. Кожнаму хочацца адчыніць іх як мага хутчэй, а затым—даказаць экзамінатару Станіславу Антонавічу Пахута свае глыбокія веды па тэарэтычнай механіцы. Але, як гэта ні прыемна, чарга ёсць чарга.

Тым, хто заспаў, застаецца толькі нервова гартаць скалечаныя канспекты ды зазіраць у шчыліны дзвярэй. А Ала Масюк будуе з крэслаў цэлую вавілонскую вежу і з яе вышыні цераз шкло устрывожана заглядае на стол экзамінатара: як ён—не надта сёння суровы?

Не, калі Станіславу Антонавічу добра адказваць, ён, безумоўна, не суровы. Ён ледзь прыкметна—вугалкамі вуснаў—усміхаецца, слухаючы, як чотка і лаканічна даказвае тэарэмы Карно студэнтка Зоя Малікава.

— А якое значэнне мае прынцып Лагранша?

Зоя хвіліну збіраецца з думкамі. Ала Байко хоча ёй дапамагчы, і, склаўшы далоні рупарам, нешта падказвае. Але Малікава адмоўна ківае галавой: не, спраўлюся сама. Яна спакойна запісвае розныя формулы, алоўкам малюе схему—і задаволены экзамінатар бярэ у рукі заліковую кніжку. Зоя устрывожана сочыць за рукой Станіслава Антонавіча: можа і чацвёрка. Але не...

— Нічога не скажаш, выдатна!—кажа ён на развітанне.

Услед за Зояй выдатныя ацэнкі атрымліваюць Ала Гайко і Іна Міраненка. Здаецца ўсё ідзе добра, аднак...

За стол, засланы жоўтым абрусам, садзіцца Нэла Міраненка. Яна нервова камячыць білет, углядаецца кудысьці за акно, але ўсё гэта не выратоўвае становішча. Відаць, што Нэла не разумее сэнсу запісаных ёю на паперы, а мо' і перапісаных са шпаргалкі доўгіх радкоў складанай формулы. Станіслаў Антонавіч для заспакаення закурвае папіросу і пачынае праходжвацца уздоўж сталоў. Яго увагу прыцягвае падазронае шалясценне паперы у руках Л. Міланові́ч. Ці то сама хоча сёе-тое падгледзець, ці іншаму дапамагчы... Экзамінатар канфіскуе салідную стопку вырваных з канспекта лістоў і вяртаецца да разгубленай Нэлы.

— Больш не магу, чым «пасрэдна». Самі вінаваты.

Вядома, Нэлу гэта не задавальняе. Хутка яна зноў вяртаецца, на гэты раз... з медыцынскай даведкай. Бачыце, нешта нездаровілася і наогул...

Нажаль, Нэла—не выключэнне. Элементарных рэчаў не ведалі Ф. Гінзбург, М. Міхейчык, Н. Вінцэвіч. Іх пасрэдныя адзнакі— вынік дрэннай падрыхтоўкі да экзамена. Відаць, недастаткова «хварэла» за іх з-за дзвярэй Ала Масюк і яе сяброўкі. «Хварэць» трэба было раней, пры падрыхтоўцы!

— А наогул,—гаворыць пасля экзамена Станіслаў Антонавіч,—ведамі студэнтаў я задаволен. Курс гадавы досыць цяжкі. Я баяўся, што будзе горш. А так—глядзіце: з 27 студэнтаў другой групы 12 здалі на «выдатна», 11—на «добра» і толькі чацвёра... Нядобра гэта, але як цудоўна адказвалі З. Малікава, Н. Бабкова, Т. Кастко!

**А. МАЛЬДЗІС.**

